Текст: CityDog.by

13.12.2021 👁 469



Ух ты! Посмотрите, какие книги читал тот самый Максим Богданович, – у вас такие есть?

На прошлой неделе классику белорусской литературы Максиму Богдановичу исполнилось 130 лет. В честь этого в музее книги Национальной библиотеки Беларуси реконструировали собрание самых важных литературных произведений в жизни белорусского классика.

Мы сходили на выставку о книгах, которые были по-настоящему дороги **Максиму Богдановичу**. Нашим экскурсоводом стал культуролог и книговед **Алесь Суша**.

«Вянок» Максіма Багдановіча: паэт дакладна трымаў гэты асобнік

– Гэта прыжыццёвы зборнік вершаў Багдановіча, выдадзены ў 1914 годзе ў віленскай друкарні **Марціна Кухты**. Канкрэтна гэты асобнік дакладна быў у руках у Максіма, пра што сведчыць аўтограф аўтара **Мікалаю Карутуеву**.

МАКСІМ БОГДАНОВІЧ.

ВЯНОК.

© citydog.by



СПІСОК БЕЛАРУСКІХ КНІГ.

I. Да навучаньня.

			Цэна к.
11	біс	Беларускі лемантар	6
12	біс	Першае чытаньне, Цёткі	6
13		Другое чытаньне, Коласа	25
14		Katolicki katechizm	5

II. Навуковые даступные для ўсіх.

21		Гутаркі аб небі і зямлі з рысункамі	15
22	біс	Цукер, В. Тройцы	3
23	біс	Гутаркі аб гаспадарцы	3
24	біс	Як ратаваць уздутую жывёлу	3
25	біс	Як бараніцца ад халеры	1
26	біс	Як рабіць добрые рамовые вульлі	5
27	біс	Зямельная справа у Новай Зэляндіі	3
28	біс	Аб гаспадарцы на хутарох і шнурох	5
29	біс	Каротная гісторыя Беларусі—Власта	60
210		Беларусы і іх нацыянальнае адраджэньне	5
211		Bł. Andrej Bobola mučynik	5
212	біс	Як ужываць штучны наваз	2
213		Pčalina—žywiołka malaja a karyści daje mnoha	30
214		Як багацеюць чэскіе селяне	10
215		Як выбіраць дэпутатоў у Гас. Думу	3
216		На дарозі да новаго жыцьця. А. Новіча	20
217		Alkahol	2
218		Rady dla matak	3

III. Повесьці, апавяданьня прозай.

31		Дым, Кононіцкай	4
32		Казкі	6
33	біс	Гапкі, Э. Ожэшко	
34	біс	Казка аб [illegible]	
35		Арзін і Лявонка. Горкага	

МАКСІМ БОГДАНОВІЧ.

ВЯНОК

кніжка выбраных вершоў.

[illegible]

ВІЛЬНЯ, ДРУКАРНЯ МАРЦІНА КУТЫ.
1913.

096
6081

© citydog.by



МАКСІМ БОГДАНОВІЧ.

Николаю Рафаиловичу
Кокуеву
отъ автора.
М. Богдановичъ.
Апрел. 1914.

ВЯНОК
кніжка выбраных вершоў.

citydog.by



* * *

Ой, чаму я стаў паэтам
Ў нашай беднай старане?
Грудзі ныюць, цела вяне,
А спачыцць ня можна мне:
Думкі з розуму ліюцца,
Пачуцьцё з душы бяжыць..
Мо за імі кроў палыне
І тады ўжо досі жыць!

72

* * *

Даўно ўжо целам я хвараю,
І хвор душой, —
І толькі на цябе надзея,
Край родны мой!
У родным краю ёсць крыніца
Жывой вады.
Там толькі я змагу пазбыцца
Сваей нуды.
Калі-ж у ім умру—загіну,—
Не жалюсь я!
Ня будзеш цяжкая ты сыну
Свайму, зямля.
Там хоць у гліне, хоць у брудзе,
Там пад зямлёй,
Найдуць мае слабые грудзі
Сабе спакой.

73

citydog.by

«Беларускае адраджэнне» Максіма Багдановіча: паэт быў адным з першых, хто мэтанакіравана займаўся прома сваёй творчасці

Гэты тэкст быў напісаны Багдановічам для часопіса «Украинская жизнь». Пазней ён пабачыў свет у выглядзе асобнага адбітка з часопіса – папулярная практыка на той час. На гэтым асобніку можна заўважыць уласнаручны допіс Максіма «для отзыва».

Допіс сведчыць пра тое, што Багдановіч быў адным з першых беларускіх аўтараў, якія актыўна займаліся прасоўваннем сваіх твораў, скіроўваючы іх у розныя рэдакцыі, навукоўцам і літаратуразнаўцам для атрымання рэцэнзій і водгукаў.



Отдѣльный оттискъ изъ журнала „Украинская Жизнь" № 1—2 1915 г.

Бѣлорусское возрожденіе.

I.

«Беларускае адраджэнне» – знакавая і незаслужана паўзабытая сёння праца. Гэты твор зрабіў значны ўнёсак у асэнсаванне беларусамі сваіх каранёў і каштоўнасцей уласнай культуры. У «Беларускім адраджэнні» Максім Багдановіч упершыню па-беларуску выклаў сваё бачанне нацыянальнай гісторыка-культурнай дынамікі з акцэнтам на часы **Францыска Скарыны** – класічны перыяд Адраджэння. Праца, безумоўна, застаецца актуальнай дагэтуль.



citydog.by

Газета «Наша Доля»: чытаў яе яшчэ падлеткам

Гэта першае легальнае перыядычнае выданне на беларускай мове. Хаця выйшла літаральна некалькі нумароў і амаль усе яны, апрача аднаго, былі забаронены цэнзурай, Максім Багдановіч дакладна меў у сябе некалькі асобнікаў.

У 1906 годзе, калі газета ўбачыла свет, Максіму было 15 гадоў, але нават у такім маладым узросце ён уважліва сачыў за выхадам першых беларускіх выданняў.




„ECHO" pismo tygodniowe

НОВООТКРЫТАЯ ТИПОГРАФІЯ

„Артель Печатнаго Дѣла",

на всѣхъ европейск. языкахъ.

ЛИТОУСКАЯ КНИГАРНЯ

М. Пясэцкой-Шляпэлис

Ад Рэдакции.

Усялякіе грошы прысыланые у Рэдакцію „Нашае Долі", просим прысылаць канечне на имя Ефстафія Сымоновича.

Пагром.

citydog.by

«Жалейка» Янкі Купалы: Багдановіч адразу заўважыў гэтага пачаткоўца

Сёння **Янка Купала** – класік беларускай літаратуры, а напачатку XX стагодзя быў маладым пачынальнікам, талент якогда адразу адзначыў Максім Багдановіч. Зборнік «Жалейка» выпускаўся пецярбургскай суполкай «Загляне сонца ў наша аконца» і меў прывабнае мастацкае афармленне. «Жалейка» ў поўнай меры дазволіла паказаць выключны талент беларускага песняра Янкі Купалы.

citydog.by



«Паўлінка» Янкі Купалы: звярніце ўвагу на націскі

Гэта першая публікацыя (1913 г.) знакамітай у далейшым п’есы Янкі Купалы, якая ўключана ў дзяржаўны спіс гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі.

Варта звярнуць увагу на тое, што на кожным слове ў выданні ёсць націск. П’еса адразу ж пасля публікацыі стала вельмі папулярнай, яе ставілі як прафесійныя, так і аматарскія тэатры, у тым ліку па-за межамі Расійскай імперыі. А паколькі граматыкі беларускай мовы тады яшчэ не было, кожны размаўляў на дыялектнай форме мовы, якой навучыўся ад бацькоў. Таму націскі ў тэксце былі вельмі патрэбнымі.





ПАЎЛІНКА.

Сцэны изъ шляхоцкаго жыцьця
у 2-х актах.

Янкі Купалы.

ПЕЦЯРБУРГ. 1913.

© citydog.by



- 6 -

ці, дзякаваць Богу хватае; часам татка дае грошы і на сукенкі... Чаго, чаго, здаецца, тут хацець?.. Ох, ох, якжэ маркотнінька! Прост, хоць збірай манаткі ды ідзі ў прочкі с хаткі. Ужо вечарэе: зараз ня будзе як шыць, а трэба сягоньня канешне коньчыць. Заўтра Пакровы... у Міхалішках кірмаш... Эх, эх! каб хаця той прыехаў, каго так хочацца сягоньня пабачыць. /Садзіцца пры вакне і пачынае ізноў шыючы пець/.

Ой, ляцелі гусі дый над Беларусю,
Селі яны, палі на сінім Дунаю!

Селі яны, палі, ваду замуцілі,
Дый нас маладзенькіх з сабой разлучылі.

Бадай тые гусі марне запрапалі,
Як мы любіліся - цяпер перэсталі.

/Паглядзеўшы ў вакно/. Ну, ўжо німа як саўсім без агню шыць! Зараз трэба запаліць лямпу. Цямнее і цямнее, ночка наближаецца, а яго як німа, так німа! А ўчыра абецаўся вельма напэўна прыйці. /Шукае запалак і запаліває лямпу/. І што гэты тата да яго мае? С таго часу, як даведаўся, што ён на мяне мілым вокам пагледае, - усё роўна, як чор-

- 7 -

ная котка між імі перабегла. Ён то нічога, але тата дык жыўцом-бы яго зьеў. Ну, але тата сваё, Якім сваё, а я - сваё. Паглядзім, чый верх будзе: таткаў, ці мой, ці яго? /Падумаўшы/. Казаў прыйдзе сягоньня, каб там і ліха гарэла. "Трэба, кажэ, сякую, ці такую зрабіць пастанову. Мы, кажэ, ня дзеці, - маем свой розум і можэм сабой пакіравацца. Толькі ты, кажэ, Паўлінка, павінна на гэта пристаць канешне, бо іначэй, кажэ, згінем, як рудые мышы". /Ускочыўшы/. Ай! нехта ідзе. Ён, ён, напэўна ён!!

прав.

ЗЪЯВА II - ая.
ПАЎЛІНКА - ЯКІМ.

ЯКІМ. Вось і я - як тут быў! Добры вечар ясьне-пекная панне Паўлінцэ. Што, золатцэ маё ненагляднае, прачэкалася трохі мяне, ненавістніка? /Глянуўшы на бакі/. А ці нікога німа? /Гаворучы, падбліжаецца к Паўлінцэ, вітаецца і хочэ абняць яе/.

ПАЎЛІНКА /баронючыся/. Ой, ой! памалу. Усе дома, усе дома. Толькі ў Якіма ня ўсе дома, бо по-начы ходзе да маладых дзеўчат. Дадуць, дадуць зараз пытлю старые. /Тупаючы нагой/. Паз-

© citydog.by



дзе: та́ткаў, ці мой, ці яго? /Паду́маўшы/. Казаў прыдзе сяго́ння, каб там і лі́ха гарэ́ла. "Трэ́ба, ка́жэ, сяку́ю, ці таку́ю зрабі́ць пастано́ву. Мы, ка́жэ, ня дзе́ці, - ма́ем свой ро́зум і мо́жэм сабо́й пакірава́цца. То́лькі ты, ка́жэ, Паўлі́нка, паві́нна на гэ́та пры́ста́ць кане́шне, бо іна́чэй, ка́жэ, згі́нем, як руды́е мы́шы". /Ускочы́ўшы/. Ай! не́хта ідзе́. Ён, ён, напэ́ўна ён!!

прав.

ЗЬЯВА II - ая.

ПАЎЛІНКА - ЯКІМ.

ЯКІ́М. Вось і я - як тут быў! До́бры ве́чар я́сьне-пе́кнай па́нне Паўлі́нцэ. Што, зо́латцэ маё ненаві́стніка? нагля́днае, прачэка́лася тро́хі мяне́, ненаві́стніка? /Гля́нуўшы на бакі́/. А ці ніко́га німа́? /Гаво́ручы, падбліжа́ецца к Паўлі́нцэ, віта́ецца і хо́чэ абня́ць яе́/.

ПАЎЛІНКА /баро́нючыся/. Ой, ой! пама́лу. Ўсе́ до́ма, ўсе́ до́ма. То́лькі ў Які́ма ня ўсе́ до́ма, бо да-по́-начы хо́дзе да малады́х дзеўча́т. Дадуць, дадуць за́раз пы́тлю стары́е. /Ту́паючы наго́й/. Паз-

citydog.by

«Нёманоў дар» Якуба Коласа: выданне передала Літоўская нацыянальная бібліятэка

У бібліятэцы Багдановіча былі ўсе літаратурна-мастацкія творы **Якуба Коласа**. «Нёманоў дар» быў выпушчаны ў 1913 годзе ў Пецярбургу пад імём Тараса Гушчы – адзін з псеўданімаў **Канстанціна Міцкевіча**. Гэта выданне нам перадала Літоўская нацыянальная бібліятэка.



1Н//311946
(039)

ТАРАС ГУШЧА.

Нёманоў дар.

Пецярбург.
1913.

Ба
citydog.by

«Кароткая гісторыя Беларусі» Вацлава Ластоўскага: як даступна расказаць пра складанае

Гэта першы нарыс айчыннай гісторыі, напісаны па-беларуску ў выглядзе адносна кароткіх паведамленняў папулярным стылем. Кніга была выпушчана кірыліцый і лацінкай, пасля публікацыі адразу стала шалёна папулярнай.

Вацлаў Ластоўскі скончыў толькі некалькі класаў пачатковай школы, але гэта не перашкодзіла яму ў далейшым стаць сакратаром Інбелкульта і акадэмікам Беларускай акадэміі навук.

Талент папулярна расказваць пра малавядомыя беларусам старонкі нашай гісторыі ад Ластоўскага перайшоў да Багдановіча.



WŁAST.

KAROTKAJA HISTORYJA
BIEŁARUSI
Z 40 RYSUNKAMI.

WILNIA.
Drukarnia Marcina Kuchty. Dwarcowaja, d. № 4.
1910.



była patreba, to i pieremieniali swaje imiony. Tak mała-pamału jany kłali asnowy Litoŭskamu kniastwu, až pakul Rynhold, a paśla syn jaho—Miadoŭh nie sabrali silnaho hasudarstwa, złučyŭšy i wałaści połackich, tak i litoŭskich kniazioŭ. Stalicaj maładoha litoŭskaho karaleŭstwa staŭsia Nawahrudak (ciapier pawietowy horad Minsk. hub

Čaść druhaja

ad pawarotu połackich kniazioŭ (1132 h.) da śmierci Witoŭta (1340 h.).

Za try hady paśla chaŭrusnaho pahromu kijeŭskimi kniaziami biełaruskich ziamiel narod u 1132 hadu zbuntawaŭsia proćiŭ čužyncoŭ i prahnaŭ z Połacka kniazia Światopołka, z rodu kniazioŭ Jarosławičoŭ kijeŭskich. Sabraŭšysia na wieče, narod uradziŭ wiarnuć swaich kniaziej, prawych dziedzičoŭ połackaho pasadu. Wybor wieča paŭ na kniazia Wasilka **Rohwołodwiča** (ŭnuka Ŭsiesława wialikaho). Pry hetym daŭnyja damowyje wojny i swarki zacichli; drobnyje udzielnyje kniazi ciapier padali krapčej trymacca adzin druhoha, padtrymywali mież saboj zhodu i ład, a tolki wojnami ŭ čužych ziemlach staralisia rasšyrać swaju ŭłaść. Tak jany zawaładzieli pry-Dźwinskimi ziemlami Liwoncoŭ i Łatyšoŭ. Ułaść i pawaha narodnaj rady — wieča rasšyrałasia. Wybor kniazia na Połacki pasad załažaŭ tolki ad wieča. Jano pa swajej woli pieramieniaje kniazioŭ. Tak u 1151 hadu wieče wysłało połackaho kniazia Rohwołoda ŭ Minsk, a na Połacki pasad pasadziło Raścisława; cieraz wosiem hadoŭ iznoŭ wiarnuło Rohwołoda, a ŭ 1162 h. iznoŭ skinuło jaho, wybraŭšy kniaziem Ŭsiesława Wasilkowiča.

Ŭsiesłaŭ **Wasilkowicz** należyć da ličby słaŭniejšych Połackich kniazioŭ. Jon kniažyŭ z 1160 da 1180 hodu. Narod i udzielnyje kniazi jaho wielmi lubili, wysoka ceniučy jaho razum i sprawiedliwaść; usie achwotna jaho słuchali i nazywali Wialikim kniaziem. Paśla śmierci Ŭsiesława Wasilkowiča wieče nie chacieło wybirać sabie druhoha kniazia, a zawiało **respubliku**, katoraj kirawało 30 wybaranych starcoŭ, chacia jeśče žyli syny i ŭnuki Ŭsiesława Bračysławowiča. **Respublikaj** Połackaje **kniažstwo było 9 hadoŭ**: ad 1181 da 1190 hodu. U 1190 hadu

połačanie wybirajuć swaim kniaziem niejkaho **Minhajłu**, abo Mihajłu. Skora jon pieredaje pasad synu swajmu **Ginwiłłu**.

Nowy kniaź pobač pahanskaho—litoŭskaho imieni Ginwiłło nosiŭ i chryścijanskaje imia Juryja; ženat z dačkoj ruskaho kniazia, chryścijankaj ŭschodniaho abradu. Ginwiłło pamior ŭ 1199 hadu u Oršy.

Brančny kamień kniaźstwa Połackaho.

Chto byli hetyja Minhajło i Ginwiłło — trudna razhadać. Abjaśnieńnie može być tolki takoje, što Minhajło prynależaŭ da tahož rodu kniazioŭ Połackich, bo trudna dumać, kab połackaje wieče i udzielnyje kniazi dazwolili čužomu zachapić połacki pasad.

Paśla Ginwiłły kniaziem byŭ prosty naśliednik Iziasławowaho doma **Barys** syn Ramana Ŭsiesławowiča, (niekatoryje letapiscy **nazywajuć** jaho synam Ginwiłły), praŭnuk Iziasława Wołodzimirowiča. Barys wiadomy swajej nabožnaściu. Jon pabudawaŭ kolki chramoŭ u Połacku. Druhaja žonka Barysowa była Światochna, dačka polskaho kniazia Bolesława (Pamorskaho). Historyja ŭpaminaje ab narodnym buncie ŭ Połacku ŭ 1217 hadu, ŭ časie katoraho Światochnu zabili. Synom swaim z pieršaje žonki Barys razdaŭ Liwonskije i Latyšskije ziemli. Adzin z ich, **Wasilko**, byŭ **kniaziem Kuklejnoskim**.

citydog.by



(Pieredruk zabaroniony).

Władysłaŭ-Jakoŭ Jahajło.

citydog.by

«Словарь белорусского наречия» Івана Насовіча: невядома, што было б з нашай мовай без гэтай кнігі

Гэта самае старое выданне ў экспазіцыі, якое пабачыла свет яшчэ да нараджэння Максіма Багдановіча, у 1870 годзе.

«Словарь белорусского наречия» – першы слоўнік сучаснай беларускай мовы, запісаны ў значнай меры фанетычным прынцыпам. Слоўнік грунтуецца не на пісьмовых традыцыях старабеларускага пісьменства, а на жывой гутарковай практыцы найперш усходняй Беларусі.

«Словарь» адыграў выключную ролю ў разуменні таго, што беларуская мова – адметная, непаўторная культурная адзінка.



Ба24052к

СЛОВАРЬ

БѢЛОРУССКАГО НАРѢЧІЯ

составленный

И. И. Носовичемъ.

Изданіе Отдѣленія Русскаго языка и словесности Императорской Академіи Наукъ.

САНКТПЕТЕРБУРГЪ.
Типографія Императорской Академіи Наукъ.
[illegible]
1870.

С-Пб.



ПА́СЕРБЪ, -ба, с. м. Пасынокъ. Пасерба свойго женишъ.

ПАСІОНА́ТКА, и, с. ж. (заимствовано отъ шляхты). Вспыльчивая женщина. Такая ёна пасіонатка, што заразъ вскипиць, коли што не по ёй.

ПАСІОНА́ТЪ, а, с. м. Вспыльчивый, злой (слово заимствованное простолюдинами отъ шляхты). Панъ нашъ великій пасіонатъ, заразъ закипиць, коли ему не водь ладъ.

ПА́СІЯ, и, с. ж. (Лат. Passio—страданіе). 1) церк. Богослуженіе, совершаемое послѣ вечерни въ воскресные дни Великаго Поста, въ воспоминаніе страданій Господнихъ, состоящее въ чтеніи страстныхъ Евангелій, съ пѣніемъ страстныхъ стихиръ. Въ первое воскресенье Великаго Поста читается страстное Евангеліе отъ Матѳея, во второе отъ Марка, въ третье отъ Луки, въ четвертое отъ Іоанна. На пасію звонюць. 2) Раздраженіе, ярость. Якъ вступиць въ пасію, тогды ничо́го ему не говори.

ПА́СКА, и, с. ж. Освящаемое въ первый день Пасхи брашно для розговѣнья. Паску посвящаюць. Паскою разговѣйця. Спасибо за паску; попаддя посвѣциць паску. *Посл.*

ПА́СОКА, и, с. ж. Кровь, идущая изъ носа, отъ удара по немъ. Тресну по мордѣ, ажъ пасока потечець. Пасоку [illegible] зъ носу.

ПАТРО́НЪ, а, с. м. 1) [illegible] 2) [illegible] 3) Защитникъ, [illegible]

ПА́ТРОШКИНЕ, я, с. ср. [illegible] рыбы.

ПА́ТРОШЕНЫЙ, прич. стр. [illegible] очищенный отъ [illegible]

ПА́ТРОШИЦЬ, сов. [illegible] тренностей, отъ [illegible]

ПА́ТЧЕРКА, и, с. ж. Падчерица. [illegible] ёна патчерка, а мнѣ дочка.

ПА́ТЫКА, и, с. ж. Патока. [illegible]

ПАТЫ́НКА, и, с. ж. (Лат. Patina — [illegible]) [illegible] лическая тарелочка. Проскурку [illegible] свое.

ПАТЭНТО́ВАНЫЙ, прич. стр. отъ [illegible] въ знач. прилагательнаго. Имѣющій [illegible] дипломъ, грамоту. Докторъ [illegible] шляхциць. (Употребляется [illegible]



«Беларусы» Яўхіма Карскага: бестселер для кожнага

Гэта фундаментальная з'ява беларускай культуры, якая самім беларусам і іншым жыхарам Расійскай імперыі і замежжа паказала наяўнасць беларусаў як народа са сваёй гісторыяй, культурай, мовай, літаратурай.

«Беларусы» – выключнай значнасці выданне, і Максім Багдановіч дакладна быў з ім добра знаёмы.



Е. Ѳ. Карскій.

БѢЛОРУСЫ.

ПР.-48

ТОМЪ III.
ОЧЕРКИ СЛОВЕСНОСТИ БѢЛОРУССКАГО ПЛЕМЕНИ.
1. НАРОДНАЯ ПОЭЗІЯ.

Проверено 1936 г.

МОСКВА — 1916.



Газета «Беларус»: газета каталікоў, якую чыталі і праваслаўныя

На працягу ўсяго жыцця Максім Багдановіч працаваў з беларускай перыёдыкай, выпісваў нумары і друкаваў у іх свае творы.

Каталіцкая газета «Беларус» друкавалася лацінскім шрыфтам і была адным з вынікаў актыўнай беларусізацыі царкоўнага жыцця. Выпускнікі беларускай каталіцкай духоўнай акадэміі актыўна ўключыліся ў працэс беларускага руху. Максім Багдановіч быў праваслаўным, але, безумоўна, цікавіўся любымі ініцыятывамі беларускага жыцця.



Hod I. Wilnia 13 studnia 1913 hoda № 1.

BIEŁARUS

tydniowaja katalickaja hazeta.

Kasztuje s pierasyłkaj na hod 1 rb 50 kap na 6 miesiacau 80 kap.
Addzielny numer 3 kapiejki.

Szkada mnie hetaho naroda... bo nie maje czaho jeści (słowy Chrystusa).

Pachwalony Jezus Chrystus

Słowy katoryje skazau Chrystus 2000 hadou tamu nazad i ciapier dla nas nie staryje, i ciapier narod biełaruski nie maje czaho jeści: hoład u cieli, hoład u duszy. Dzieła taho my pryhodzim da was, miłyje braty

Dyk zwiartajemsia da Was, miłyje czytaczy, da was, kamu dorah nasz biedny, ciomny, „tutejszy" narod, kab raszyrali naszuju hazetu, kab prychodzili nam s pomaczu, chto czym može.

Žniwo wialikaje, a nima kamu haci; prychodźcie-ž żniwiary — czakajem!

Redakcija.

Kalendar kaścielny.

Studzień.

citydog.by

ВАЖНО: выставка «Библиотека Максима» продлится до 15 января. Тут все подробности.

Перепечатка материалов CityDog.by возможна только с письменного разрешения редакции. Подробности здесь.

🐾 **Фото:** Павал Хадзінскі для CityDog.by.